# Турнір “Знаўцы роднай мовы”

Класная гадзіна для вучняў 3–4 класаў

**С. У. Кавальчук,**
настаўнік пачатковых класаў
гімназіі г. Петрыкава

**Мэта:** фарміраванне цікавасці і павагі да беларускай мовы.

**Задачы:**

- пашырыць веды вучняў аб роднай краіне;
- развіваць моўную культуру, творчае мысленне;
- выхоўваць уменне ўзаемадзейнічаць у працэсе пазнавальнай дзейнасці.

**Форма правядзення:** турнір

**Абсталяванне:** мультымедыйны праектар, карткі з заданнямі.

## Ход мерапрыемства

**Настаўнік**: Сёння мы праводзім турнір “Знаўцаў беларускай мовы”. Мова ўзнікла даўным-даўно, сотні тысяч гадоў таму назад. Першабытныя людзі аб’ядноўваліся ў групы, каб паляваць на звяроў, лавіць рыбу, вырабляць прылады працы, будаваць жыллё. Каб усё гэта рабіць разам, яны павінны былі разумець адзін-аднаго. Так узніклі першыя словы. З цягам часу жыхароў планеты станавілася ўсё больш і больш. Кожны народ прыдумваў свае словы і ствараў сваю мову. Кожны народ ад іншых, у першую чаргу, адрозніваецца сваёй мовай. У рускага народа – руская мова, у нямецкага – нямецкая, у японцаў – японская, у беларусаў – беларуская. Калі мы забудзем сваю мову, перастанем на ёй размаўляць, перастане існаваць народ. І з карты свету знікне наша Беларусь. Памятайце пра гэта.

Сёння мы завітаем у госці да нашай роднай мовы.

Мы з вамі жывём у Беларусі. Беларусь – наша Радзіма. Тут мы вучымся, тут будзем працаваць. Тут жывуць нашы мамы і таты, дзядулі і бабулі. Кожны чалавек павінен ведаць сваю мову, умець спяваць народныя песні, танчыць народныя танцы, ведаць, як адзначаліся спрадвеку святы на нашай зямлі, гуляць у беларускія гульні.

**Вучаніца 1:** Радзілася я ў Беларусі,
Дзе ціхі задумлівы бор.

Ляцяць сюды з выраю гусі
Да сініх, цудоўных азёр.

**Вучаніца 2:** Стаяць векавыя дубровы,
Даносіцца ласкавы шум.
І сонца, і ветрык вясковы
Цяплом саграваюць душу…

**Вучаніца 3:** Радзілася я ў Беларусі,
Дзе срэбрам крыніцы звіняць,
Сюды з крыкам радасным гусі
З далёкага поўдню ляцяць.

**Вучаніца 4:** Палюбіць Беларусь вельмі проста,
Трэба толькі прыехаць сюды,
Дзе пявучыя стромкія сосны
І іскрыстыя сцежкі вады.

**Вучаніца 5:** Тут жывуць светларусыя людзі
І калышацца лёну блакіт.
Хто калісьці тут быў, не забудзе
Тумановы світанак ракі.

(Авяр'ян Дзеружынскі)

**Настаўнік**: Мы з вамі беларусы і вельмі любім свой край. Як мы любім нашу Беларусь, так жа мы павінны любіць і сваю родную мову. Родная мова – душа народа. Пакуль жыве мова, жыве і народ.

Пачынаем турнір "Знаўцаў беларускай мовы."

Давайце пазнаемімся з нашым журы *(прадстаўленне журы).*

Спаборнічаць сёння будуць каманды "Вандроўнікі", "Дранікі", "Буслікі" *(прадстаўленне каманд).*

Пажадаем удзельнікам поспехаў. Няхай пераможа мудрэйшы!

*(за кожнае дакладна выкананнае заданне, адказ – 1 бал, турнір суправаджаецца мультымедыйнай прэзентцыяй)*

<u>**1 конкурс**</u>

**Адгадайце загадкі:**

Ляжыць, не ходзіць, а сама ўсіх водзіць. (Сцежка)
Еду, еду – ні дарогі, ні следу. (Лодка)
У агні не гарыць і ў вадзе не тоне. (Лёд)

<u>**2 конкурс**</u>

**Кот у мяшку.** *Адгадайце, што ў мяшку?*

Маленькі, кругленькі, а за хвост не падымеш. (Клубок)

**3 конкурс**

**Пагуляем у рыфмы: жывы — нежывы.** *Кожнай камандзе прапанаваны словы, якія абазначаюць назвы жывых прадметаў, да іх трэба падабраць рыфму, каб атрымаўся нежывы прадмет. Напрыклад: рак — мак. За правільны адказ — 1 бал.*

казуля (кашуля) вожык (кошык)
жабка (шапка) кошка (дошка)
мышка (лыжка) ліска (міска)

*Складзіце верш, выкарыстоўваючы дадзеныя словы.*

**4 конкурс**

**Метаграмы.** *У зыходным слове замяніць адну літару, каб атрымалася іншае слова.*

З “е” дружу з будаўнікамі.
З “а” купляю у хлебнай краме.
*(бетон – батон)*
У лесе з “б” мяне шукаеш
І з прыемнасцю зразаеш.
Калі “б” на “п” заменіш –
Сцеражыся: захварэеш!
*(грыб – грып)*

**5 конкурс**

**Выправі памылкі**

"Малако дае карова", —
Напісаў на кошцы Вова. *(Дошцы)*
Закрычаў Рыгорка:
“З неба ўпала горка!” *(Зорка)*
Весела звініць збанок,
Кліча: "Дзеці, на ўрок". *(Званок)*
Не праедзем, дружа,
На дарозе ружа. *(Лужа)*
Кажа Славік Светцы:
"Цесна тыгру ў кветцы". *(Клетцы)*
*Музычная пауза (“Гаворка беларуская”)*

**6 конкурс**

**Наборшчыкі**

*З прапанаваных літар трэба скласці як мага больш слоў, запісаць на ліст паперы, перадаць журы. На падрыхтоўку адводзіцца 2 хвіліны. За кожнае слова каманда атрымлівае 1 бал. Дадатковы бал прысуджаецца той камандзе, якая складзе самае доўгае слова.*

*А, К, Т, Ы, Г, А, Р, М, А (граматыка)*

**<u>7 конкурс</u>**
**Рэбусы**













**<u>8 конкурс</u>**
**Назвы беларускіх месяцаў**
*-Знайдзіце назвы месяцаў, якія «схаваны» ў гэтай табліцы*

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| К | І | В | Ч | П | Е | Л | Ю | Т | Ы |
| Е | Л | А | Э | Л | І | В | Е | Р | А |
| С | А | К | Р | О | П | Е | Н | Ь | С |
| К | Т | А | В | М | С | Е | Ь | Н | Е |
| Л | І | С | Е | А | Т | Р | Ь | Н | Е |
| П | А | Т | Н | Й | У | Ь | Н | А | Ж |
| А | Д | Г | Ь | О | Д | З | Е | Р | Е |
| К | Р | А | С | А | В | І | К | І | Н |
| С | Т | Р | Ы | Ч | Н | І | К | Ы | С |
| А | К | Ь | Н | Е | В | І | Н | Ж | А |

**<u>9 конкурс</u>**

**Закончыце прыказкі**

Чалавек без працы, як птушка без …(крылаў).
Новых сяброў набывай, а старых не …(забывай).
Век жыві, век… (вучыся).
Лёгка зламаць — ды цяжка… (зрабіць).
Увосень плача, хто ўвесну… (скача).
Малая пчала, ды і тая… (працуе).
За родны край галаву… (аддай).

**<u>10 конкурс</u>**

**Пазнай птушку**

- *Па малюнку і спевам пазнаць птушку.*

1. жаўрук,
2. крыжадзюб,
3. шпак,
4. зязюля,
5. цецярук,
6. сітаўка (пліска).

**<u>11 конкурс</u>**

**Конкурс капітанаў.** *Капітаны каманд па чарзе выцягваюць пытанне і адказваюць на яго. Калі капітан не ведае адказ, адказвае каманда.*

Якія словы маюць сто зычных? (стол, стоп, стог).
З чаго пачынаецца і чым канчаецца Нёман? (літарай Н).
Які часопіс у лесе знойдзеш? (“Вожык”).
Якую частку слова заўсёды знойдзеш у зямлі? (корань).
Якога месяца няма ў календары? (на небе).
Якая рака цячэ ў роце? (Дзясна).
Якую соль нельга дабавіць у ежу? (нота – соль).
Якую сельскагаспадарчую прыладу можна знайсці на галаве? (Каса).
Ці можа бусел назваць сябе птушкай? (Не. Не ўмее гаварыць).

*Журы падводзяць вынікі турніра.*

*Вучні чытаюць верш Ніла Гілевіча “Я – беларус”.*

Я – беларус, я нарадзіўся
На гэтай казачнай зямлі.
Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
Адвеку прашчуры жылі.

Я – беларус, я ганаруся,
Што маю гэтае імя.
Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездарма.

Я – беларус, і я шчаслівы,
Што маці мову мне дала,
Што родных песень пералівы
І зблізку чую, і здалля.

Я – беларус, і хоць сягоння
Яшчэ малы, але скажу:
“Я родам з племя непакорных
І прад бядой не задрыжу.”

Высока ў небе вырай кружыць,
Ляціць за сіні небакрай.
Не забывай ніколі,  дружа,
Сваю зямлю,  свой родны край!

*Падвядзенне вынікаў, узнагароджванне ўдзельнікаў дыпломамі і прызамі.*